**А. М. Пісарэнка,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі;*
**В. В. Шунейка,** *старшы выкладчык*
*кафедры рускай мовы як замежнай*

# КРЭАТЫЎНЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ СА СТУДЭНТАМІ Ў ВНУ ПА ФІЛАЛАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ

Сучасныя тэндэнцыі развіцця вышэйшай прафесійнай адукацыі вызначаюць кардынальнае змяненне падыходаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу. Увядзенне сістэмы шматузроўневай адукацыі, рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу абумоўліваюць неабходнасць іншага пункту гледжання на навучанне. Выкладчык павінен выконваць не толькі функцыю транслятара навуковых ведаў, але і ўмець выбіраць аптымальную стратэгію выкладання, выкарыстоўваць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, накіраваныя на стварэнне творчай атмасферы адукацыйнага працэсу.

Развіццё навукі і тэхнікі выяўляе актуальныя праблемы педагогікі, сярод якіх найбольш важнай з'яўляецца актывізацыя пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў. Выкладчыкам неабходна мэтанакіравана аваладаваць актыўнымі і інтэрактыўнымі формамі і тэхналогіямі правядзення заняткаў: гульнямі, трэнінгамі, кейсамі, гульнявым праектаваннем, крэатыўнымі тэхнікамі і іншымі прыёмамі, таму што менавіта яны развіваюць базавыя кампетэнцыі і метакампетэнцыі студэнта, фарміруюць неабходныя для прафесіі ўменні і навыкі, ствараюць перадумовы для псіхалагічнай гатоўнасці ўкараняць іх у рэальную практыку.

Крэатыўныя заняткі акумулююць метады і прыёмы розных формаў навучання. Яны будуюцца на сумеснай дзейнасці педагога і навучэнцаў, на агульным пошуку з мэтай павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Сама арганізацыя такіх заняткаў падводзіць студэнтаў да неабходнасці творчага падыходу, у працэсе правядзення складаюцца спрыяльныя адносіны для развіцця творчага мыслення, фарміруецца станоўчая матывацыя да вучобы.

На такіх занятках магчыма дасягнуць самых розных мэт метадычнага, педагагічнага і псіхалагічнага характару, развіцця творчага патэнцыялу асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя прыметы нетрадыцыйнай формы навучання:

– адмаўленне ад шаблонаў, прысутнасць элементаў новага ў арганізацыі заняткаў;

– выкарыстанне пазапраграмнага матэрыялу;

– арганізацыя калектыўнай дзейнасці навучэнцаў у спалучэнні з індывідуальнай;

– выкарыстанне інфармацыйных і камп'ютарных тэхналогій, мультымедыйнага абсталявання, відэа;

– прадастаўленне навучэнцам магчымасці раскрыцца з новых бакоў і арыентавацца ў атмасферы творчага пошуку;

– неабходнасць сур'ёзнай папярэдняй падрыхтоўкі.

На кафедры беларускай і замежнай філалогіі распрацоўваюцца і ўкараняюцца новыя крэатыўныя методыкі навучання, нестандартныя формы правядзення заняткаў, ці асобных заданняў творчага характару, якасныя паказчыкі якіх накіраваны на: 1) выяўленне творчых здольнасцей студэнтаў, 2) папулярызацыю роднай мовы і розных літаратур, 3) на патрыятычнае і эстэтычнае выхаванне моладзі, 4) на развіццё каультурамоўных паводзінаў, 5) на навуковы пошук, зацікаўленасць навукай і адпаведныя адкрыцці, 6) на самастойнае стварэнне і аналіз рэкламных тэкстаў, 7) на адпаведнасць зместу і малюнка рэкламы, 8) на наяўнасць памылак рэкламы на білбордах (напрыклад, тэзіс «Агрэст – смак беларускай мовы» не пацвярджае адметнасць беларускай мовы, паколькі дадзенае слова паланізм, у ім [г] выбухны, а не спецыфічны, фрыкатыўны), метро і ў іншых грамадскіх месцах, 9) выпраўленне і ўдасканаленне зместу і формы рэкламных тэкстаў, 10) на развіццё прафесійных маўленчых і іншых уменняў і навыкаў студэнтаў спецыяльнасці рэкламнай дзейнасці, 11) выпрацоўку эстэтычнага густу як рэкламістаў, так і спажыўцоў рэкламнай прадукцыі, 12) на выпрацоўку прафесійнага выкарыстання слова (вобразнага і нявобразнага) як аб'екта ўздзеяння з мэтай зацікавіць прадуктамі, рэчамі, паслугамі і іншымі аб'ектамі рэкламы.

На занятках па КПВ «Мастацкія плыні XX ст.» студэнтам 4 курса прапаноўваюцца розныя варыянты бягучай праверкі ведаў: класічны тэст з пытаннямі па тэме ці творчая работа. Творчая работа па тэме «Мастацкія плыні ў літаратуры канца XIX – пачатку XX ст. Эстэтызм» заключаецца ў тым, што студэнты павінны напісаць тэкст у стылі эстэтызму, прытрымліваючыся яго асаблівасцей і ўлічваючы яго асноўныя рысы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заняткі па КПВ «Беларуская паэзія ў музычным увасабленні» завяршаюцца залікам у форме літаратурна-музычнай кампазіцыі: студэнты спяваюць песні, часам па тэматычна-часавых блоках; такая форма якраз адпавядае палітыцы па захаванні кантынгенту навучэнцаў.

Завяршальным этапам КПВ «Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе», які чытаецца для студэнтаў спецыяльнацей «культуралогія», «сацыяльна-культурная дзейнасць», з'яўляецца залік, на якім студэнты паказваюць рэкламу, зробленую на самастойна выбраныя тавары, паслугі, творчыя падзеі. Пасля вывучэння і авалодання асновамі тэорыі дадзенай дысцыпліны будучыя спецыялісты на практычных занятках аналізуюць вядомыя рэкламныя тэксты, шукаюць і выпраўляюць у іх рознага кшталту памылкі, удасканальваюць форму і змест рэкламных слоганаў і інш. Як вынік – стварэнне ўласнай рэкламы, дзе дэманструецца ступень валодання стылістычнымі рэсурсамі мовы, творчае арыгінальнае мысленне з мэтай праз мову/маўленне зацікавіць рэчамі, паслугамі, прадуктам.

У сучасным адукацыйным працэсе існуе праблема арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. Праблема звязана з новай роляй самастойнай работы, якую яна набывае ў сувязі з пераходам на дзейнасную парадыгму адукацыі. У выніку гэтага пераходу самастойная работа становіцца вядучай формай арганізацыі навучальнага працэсу, і разам з гэтым узнікае праблема яе актывізацыі. У цяперашні час неабходна павышаць эфектыўнасць самастойнай працы ў дасягненні якасна новых мэт адукацыі па фарміраванні прафесійнай кампетэнцыі студэнтаў.

Кіруемая самастойная работа (далей КСР) па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» будуецца з улікам прафесійна арыентаванай накіраванасці навучання ці выяўлення творчых здольнасцей студэнтаў: мастацтвазнаўцы, напрыклад, рыхтуюць паведамленні пра гісторыка-культурныя помнікі краіны; бібліятэказнаўцы – прэзентацыю кнігі; студэнты, якія навучаюцца на спецыялізацыі «рэкламная справа», пішуць паведамленні адпаведнага зместу ці ствараюць уласна рэкламы і г. д. Па тэме «Лексікаграфія» студэнты ствараюць уласныя тлумачальныя слоўнікі, змест якіх адлюстроўвае лексіку прафесійнага маўлення, а форма – на выбар студэнта (класічная –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на лістах фармату А4 ці ў выглядзе музычных інструментаў, кніг, шафы ці інш.).

Заняткі па мовазнаўчых дысцыплінах могуць праводзіцца ў форме навуковых канферэнцый (тэма «Камунікатыўныя якасці маўлення»). У такой форме заняткі будуюцца наступным чынам: падзел студэнтаў на групы па 2–3 студэнтаў у залежнасці ад агульнай колькасці; размеркаванне тэм па групах (дакладнасць, лагічнасць, дарэчнасць, чысціня і г. д. маўлення); азнаямленне студэнтаў з усімі тэмамі. Аднак аналіз/лінгвістычны зрэз робіцца кожнай падгрупай па абранай ці прызначанай тэме, таксама праводзіцца дыягностыка на рэалізацыю/праяўленне ўсіх камунікатыўных якасцей маўлення ў групе. Праца афармляецца яе даклад з аналізам памылак (культурамоўнага зместу), з рэкамендацыямі ад аўтараў/выступоўцаў, як пазбегнуць тых ці іншых памылак маўлення і ўзбагаціць слоўнікавы запас, як дакладнасць і выразнасць маўлення дазволіць пазбегнуць маўленчай агрэсіі студэнцкай аўдыторыі і ў будучыні дазволіць спецыялістам сферы культуры прэзентаваць свае здольнасці, навыкі.

Па спецкурсе «Культура прафесійнага маўлення» студэнтам даецца заданне па выяўленні і аналізе памылак уласных, сваіх калег па працы, студэнтаў групы, а таксама аналіз назваў крам, кафэ, цукерак і іншых прадуктаў; праводзіцца лінгвістычнае і экстралінгвістычнае асэнсаванне адпаведнасці формы і зместу. Студэнты факультэта ТБКіСМ пішуць рэцэнзіі на спектаклі, кінафільмы, аналізуюць назвы карцін як носьбітаў ідэі твора выяўленчага мастацтва: «Я еду ў 5-ым вагоне», «Ліза Моніна» – мастак Валерый Губараў, Марк Шагал «Гадзіннік з сінім крылом», «Зялёны скрыпач» і інш. Часам назвы карцін могуць атасаямляцца з назвамі твораў іншых відаў мастацтваў («Гракі прыляцелі» А. Саўрасаў і «Гракі прыляцелі» – назва адной з частак рамана І. Шамякіна «Злая зорка»). Пытанні такога кшталту разглядаюцца таксама на спецкурсе «Інтэрпрэтацыя літаратурных твораў іншымі відамі мастацтваў».

Заняткі ў класічнай, стандартнай форме могуць не выклікаць у навучэнцаў інтарэсу. Вопыт многіх выкладчыкаў паказвае, што студэнт з цікавасцю наведвае першую лекцыю/практычныя заняткі новага прадмета, чакаючы шмат цікавага і неабходнага для прафесійнай дзейнасці. Аднак праз нейкі час цікавасць да вучобы знікае, падае наведвальнасць. Аднастай-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя лекцыі, заняткі, пабудаваныя па адной схеме, не стымулююць пазнавальную дзейнасць моладзі. Думаецца, па любой тэме, якая вывучаецца па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», павінны быць заданні практыка-арыентаванага зместу, у тым ліку творчага характару, накіраваныя на праяўленне крэатыўнага падыходу сучасных студэнтаў: так, напрыклад, для будучых спевакоў (ФММ) прапаноўваецца выбраць беларускую песню (тэма «Фанетыка-арфаэпічныя асаблівасці мовы») і прааналізаваць у ёй спецыфіку вымаўлення галосных і зычных гукаў, а затым праспяваць/прачытаць тэкст у адпаведнасці з названымі нормамі. Па тэме «Ужыванне вялікай літары» (раздзел «Арфаграфія») студэнты пішуць незвычайную творчую біяграфію ў выглядзе ілюстрацый да правіла, не будуючы сказы. У гэтым выпадку кожны радок з правіла пацвярджаецца ўласнымі звесткамі:

*З вялікай літары пішуцца:*

*– імёны, імёны па бацьку, прозвішчы – Багушэвіч Таццяна Пятроўна;*

*– геаграфічныя назвы: вёскі, гарады, абласныя і раённыя цэнтры – вёска Рыбная, горад Віцебск;*

*– калі дома ёсць жывёлы – мянушкі жывёл – сабака такса Такса.*

А таксама *назвы любімых кніг, кінафільмаў*, што звязана з разглядаемым правілам і з асобай студэнта (такая інфармацыя шмат дае для далейшай індывідуальнай працы з чалавекам).

Падчас вывучэння тэмы «Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання» разглядаецца пытанне аб разбурэнні чысціні маўлення праз выкарыстанне жарганізмаў (аналізуюцца прычыны ўжывання слоў, абмежаваных сацыяльным асяроддзем, прафесійнай сферай), іх уплыў на культурамоўныя паводзіны асобы студэнта і шляхі пазбаўлення (як правіла, праз выкарыстанне агульнаўжывальных сінонімаў, сінонімаў-тэрмінаў) гэтага віду маўленчай агрэсіі.

У тэме «Лексіка беларускай мовы паводле паходжання» сярод розных запазычаных слоў разглядаюцца варварызмы. Адным з заданняў з’яўляецца аналіз варварызмаў сучаснага жыцця, другім – устойлівых выразаў з лацінскай мовы, пажадана звязаных:

– са сферай культуры (Vita brevis, ars est longus (лац.) – жыццё кароткае – мастацтва вечнае);



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ці з выразамі, якія дэманструюць унутранае крэда студэнта (Sapienti sat (лац.) – разумнаму дастаткова).

Відавочна, што практыкаванні накіраваны на фарміраванне маўленчай этыкі, на ўжыванне беларускай мовы ў культуры, у прафесійным асяроддзі; выяўленне сінтэзу мастацтваў, адным з якіх з'яўляецца мастацкая літаратура і мова як яе складнік. Такі падыход развівае эстэтычны густ асобы, творчы падыход да прафесіі, фарміруе мастацкі кругагляд: адна справа літаратурны шэдэўр, твор А. Дэ Сэнт-Экзюперы «Маленькі прынц», іншая справа – балет па гэтым творы (музыка і харэаграфія перадаюць сэнс).

Кіруемая самастойная работа па дысцыпліне «Беларуская і сусветная літаратура: беларуская літаратура» можа таксама ставіцца ў тэатры цалкам ці часткова (П. В. Васючэнка «Страшнік Гам»), а самі заняткі могуць праводзіцца ў форме конкурса чытальнікаў («Паэзія М. Багдановіча», «Паэтычная творчасць У. Караткевіча», «Літаратурная галерэя юбіляраў года»).

Вопыт выкладання філалагічных дысцыплін дазволіў зрабіць выснову, што гнуткае спалучэнне разнастайных нетрадыцыйных формаў арганізацыі аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў спрыяе стварэнню аптымальных умоў для кампетэнтнаснага асваення студэнтамі навучальнага матэрыялу, які падаецца ў цікавай, незвычайнай форме; уключэнню студэнтаў у разнастайныя віды дзейнасці (франтальную, калектыўную, групавую, парную, індывідуальную); апусканню навучэнцаў у кантэкст будучай прафесіі; аптымальнаму спалучэнню вывучэння тэарэтычных асноў дысцыпліны з фарміраваннем практычных навыкаў у сітуацыях, набліжаных да рэальнага жыцця, што ў сукупнасці дае магутны стымул у навучанні, матывуе і актывізуе вучэбна-прафесійную дзейнасць будучых бібліятэкараў, спевакоў, музыкантаў, менеджэраў і г. д. Акрамя гэтага, пры атрыманні зваротнай сувязі ўдзельнікі апрабацыі адзначаюць, што нетрадыцыйная форма правядзення заняткаў спрыяе зняццю залішняга напружання, стварэнню эмацыйна-прывабнай атмасферы, узнікненню асобаснай зацікаўленасці ў вывучаемым матэрыяле, стымулюецца разумовыя працэсы, даецца магчымасць раскрыцца з новага боку, праявіць сябе ва ўмовах творчага пошуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ